# Свіслацкі Веснік

№ 3 (4)жнівень 2009







## Тэма нумара:

# Крызіс прыйшоў незаўважна

ЧЫТАЙЦЕ У НУМАРЫ:

## Кроніка пікіруючай эканомкі

Праявы крызіса ў гаспадарцы пухавіцкага раёна. Дадзеныя і аналіз

## Страшная медыцына

Што адбываецца ў сферы аховы здароў'я Пухавіцкага раёна. І што хаваецца за скупымі статыстычнымі лічбамі

## Абяцанкі-цацанкі

Падлік узроўня аплаты спецыялістаў ЗАТ "Август-Бел" наштурхнуў на думку прааналізваць выкананне абяцанняў, якія даваліся кіраўніцтвам прадпрыемства цягам мінулых двух год.

## Падставы для гонару

Адразу тры падзеі апошніх месяцаў дазваляюць ганарыцца тым, што мы жывем у Пухавіцкім раёне. Фэст у Дудутках, Велагонка і ФК "Рудзенск". Да ўсіх трох паняццяў падыходзяць эпітэты "упершыню" і "выдатна".



# “Ненужные” факты

Классик сказал: “Чтобы понять причины произошедшего события — посмотри кому это выгодно”. В годовщину “очередной кавказской войны” российские СМИ вылили кучу информации о “плохой Грузии и бравых русских парнях”. Но есть и другая сторона медали, озвученная в разное время самими российскими медиа.

***Предыстория:***

В 2006-2007 годах Грузия взяла курс на модернизацию экономики и превращение страны в транзитный пункт для азиатской нефти и газа. В добавок к газпромовскому газопроводу “Сочи-Батуми” построены газопроводы Баку-Поти, Баку-Батуми. По этим же направлением построены нефтепроводы + начато строительство трубы с потенциалом прокачки сравнимым с нашей “Дружбой”. Утверждается в качестве приоритета проект Набукко (газопровод обход РФ и без посреднических услуг “Газпрома”), в Поти строятся терминалы для загрузки жидкого газа с специальные танкеры.

При успехе проекта, РФ теряет контроль и роль посредника в торговле среднеазиатскими углеводородами, сводится к “о” роль грузового порта Новороссийск.

Но в планах есть один минус: все “трубы” из-за специфики рельефа проходят в непосредственной близости от границ Абхазии и Южной Осетии. Требование партнёров к Грузии — разрешить конфликты. Совет Европы и ООН выступают посредниками. ООН предлагает вариант конфедерации с невиданными полномочиями (максимальное самоуправление вплоть до возможности ограничения действия грузинской Конституции (!!!!) на их территориях). Республики вроде согласны, но... после поездки в июне 2008 Кокойты и Багпша в Москву они отказываются ехать на подписание соглашений. А на границах непризнанных республик начинаются провокации и обстрелы (78 случаев за 21 день). 7.08 российская армия открыто входит в Ю.Осетию. Нервы у без того не уравновешенного Саакашвили не выдерживают. Дальше мы знаем.

НО когда войска РФ входят на грузинскую территорию и по странному совпадению их цели — порт Поти и инфраструктура газо и нефтепроводов.

РЕЗУЛЬТАТ: Нефтепровод в кодорском ущелье уничтожен руками Абхазцев, нефтепровод вдоль границы с Ю. Осетией уничтожен, ветка недостроенного газопровода в г. Гори разбомблена российской авиацией. Крупнейший нефтеналивной порт на Черном море (Поти) парализован, недостроенные газовые танки (ёмкости) в Поти уничтожены.

Альтернативная доставка энергоресурсов в Европу откладывается как минимум на 3-5 лет. Проект Набукко в сентябре снимается с повестки дня ЕС как “рискованный и неактуальный”. Россия оставляет за собой статус монополиста по поставкам газа и нефти в центральную и восточную Европу.

Кстати, по удивительной “случайности” единственный непострадавший в ходе войны газопровод — принадлежащий “Газпрому” “Сочи-Батуми”. Хотя он проходил фактически по линии фронта...

*svislochanin11 (пользователь Свислочь:Региональный портал)*

**Ад рэдакцыі:** *svislochanin11 даслаў цэлы шэраг аналітычных матэрыялаў датычных канфлікта на Каўказе. Прымячальна тое, што ўсе яны базуюцца на АФІЦЫЙНЫХ дадзеных Расійскіх, Абхасках і Асецінскіх СМІ. У перакладзе на беларускую мову матэрыял будзе апублікаваны ў наступным нумары СВ.*

жадаеце выказаць сваю думку ў калонцы? дасылайце тэкст на адрас:
**sviesnik@gmail.com**

# РАЁН

## Ратаваць раённы бюджэт, на думку РВК, маюць прадпрыемствы Дружнага і Свіслачы, сельскія і пассаветы а таксама... бюджэтныя арганізацыі

Нягледзячы на бадзёрыя рапарты і заспакаенні ў мясцовай прэсе, крызіс дабраўся і да Пухавіцкага раёну. Ягоныя праявы ў, і без таго на 50% датацыйным раёне, набліжаюцца да адзнакі “катастрафічныя”.

### Ты помнишь как всё начиналось...

Усё пачыналася так добра. Даходы бюджэта-2008 былі зацверджаны у памеры 86 039 509,9 тысяч рублёў (з гэтай сумы датацыі 40 509 009 тысяч). Аднак, эканамічны пад’ем прымусіў дэпутатаў аж 5 разоў цягам года карэктаваць бюджэт у бок павялічэння. І у снежні 2008 ягоная даходная частка бюджэта зацвярджаецца ў памеры 101 808 189,9 тысяч рублёў (датацыі — 51 799 068,8 тыс.) . Такі рост, папраўдзе, выкліканы не столькі ўдалай працай раёна (рост недатацыйных паступленняў у бюджэт склаў толькі 109,8%), колькі ўзрослымі аж на 27% дзяржаўнымі датацыямі. Залаты датацыйны дождж прымусіў раённых чыноўнікаў пановаму зірнуць на выдаткі бюджэта. Першае на што пайшлі грошы — павялічэнне аб’ёмаў фінансавання органаў дзяржаўнага кіравання і самакіравання. Па студзеньскаму варыянту бюджэта “Дзяржаўныя органы агульнага прызначэння” мелі атрымаць 2 665 605,1 тыс. рублёў, а ў снежні сума вырасла да 3 299 933,0 тысяч (рост 24,3%). Радок “Мясцовае кіраванне і самакіраванне” мае рост з 2 658 010,1 тысяч да 3 292 338,0 тысяч (+ 23,8%). Нагадаем, што рост даходаў бюджэта быў усяго 18%. Трэба на чымсці эканоміць. Зэканомілі на жыллёва камунальнай гаспадарцы. Калі у студзені на яе развіццё планавалася выдзеліць 16 728 160,0 тысяч, то ў снежні сума зменьшылася да 16 284 218,6 (-2,7% ). Мусіць, няма праблем у нашай ЖКГ.

Варта зазначыць, што падставы для апытмізма, нягледзячы на крызіс былі. “Ратаўнікам” раённага бюджэта традыцыйна мелі стаць прадпрыемствы, якія размешчаны на тэрыторыі Свіслачы і Дружнага (збольшага прампляцоўка ЦЭЦ-5 і сама ЦЭЦ). Менавіта тут рэалізуюцца 3 найбуйнейшыя ў Беларусі (па выніках першых чатырох месяцаў 2009 года) інвестыцыйных праекта. Гэта другі блок ЦЭЦ-5, рэканструкцыя Завода Горнага Воска і сумнавядомае будаўніцтва ЗАТ “Август-Бел”. Рэалізацыя дадзеных праграм мела прывесці да роста занятасці да і проста забеспячэння мясцовых будаўнікоў замовамі. А гэта — падатковыя адлічэнні.

> Цягам 2008 года бюджэт вырас на 18%. У выніку, раённыя чыноўнікі павялічылі сваё фінансаванне на 24,3 і 23.8%. А выдаткі на ЖКГ скарацілі на 2.7%.

### Будаўніцтва паветраных замкаў

Шчодрасць 2008 года дазволіла дэпутатам райсавета зацвердзіць бюджэт у памеры 118 747 835 тысяч рублёў і (з гэтай сумы) разлічваць на датацыі ў 52 598 818 тысяч. Пры гэтым, з падачы эканамістаў РВК, дэпутаты райсавета традыцыйна забралі “у раён” ўсе магчымыя крыніцы паступлення сродкаў, пакінуўшы мясцовым органам самакіравання (сельскім і пассаветам) толькі даходы ад падатку на нерухомасць.

### Удар рэчаіснасцю

Аднак, што добра на паперы, не заўсёды ідэальна ў жыцці. Выканальнікамі большай часткі работ на пляцоўках сталі арганізацыі з-за межаў раёна. Нават любімы РВК “Август” размяшчаў свае замовы дзе заўгодна, толькі не ў мясцовых суб’ектах гаспадарання. А тут далі знаць і праблемы іншых арганізацый раёна. Пухавіцкая картонная фабрыка “дапрацавалася” да такога стану што не здолела разлічыцца нават з газавікамі, непляцяжы Райспажыўсаюза за

# “Крызіснула”

пастаўленую прадукцыю сталі настолькі акуальнай праблемай, што на іх звярнулі ўвагу кіраўніцтва вобласцю і рэспубліканскага райспажыўсаюза.

Адначасова перасталі разлічвацца і з нашымі прадпрыемствамі. Напрыклад, юрысты “Эксперыментальнай базы “Свіслач” НАН РБ” “не вылазяць” з гаспадарчага суда ў спробах спагнаць з аграрыяў па ўсёй Беларусі заробленыя “Свіслаччу” сродкі.

Да пэўнага часу раён падстрахоўваўся датацыйнымі грашыма, ў разліку “вернуць сваё” у другім паўгоддзі. Аднак, пасля рашэння Саўміна пра секвестр (змяншэнне расходнай часткі) дзяржбюджэта стала зразумела, што на 51 мільярд датацый на раён у 2009 спадзявацца не выпадае. Неўзабаве Мінаблвыканкам указаў на патрэбу зарабляць самім. Адпаведна, канец першага паўгоддзя ў раёне стаў “халодным душам” для чыноўнікаў. Дзяржаўныя грошы мелі прыйсці толькі з ліпеня-жніўня а ў бюджэце суцэльны мінус. Першымі пачалі галасіць самыя слабыя — медыкі і установы адукацыі. У ЦРБ і ў адзела адукацыі не знайшлося сродкаў нават на аплату за пастаўкі мясамалочнай прадукцыі для харчавання дзяцей і хворых. Да гонару пастаўшчыкоў, яны не спынілі адгрузку, але змясцілі пухавіцкія арганізацыі у своеасаблівы “спіс ганьбы” — пералік неплацельшчыкаў, якія не разлічваюцца месяц і болей. Сітуацыю ратуе толькі тое, што на двары сярэдзіна лета і ў школах вакацыі. А медустановы не так загружаны хворымі як у асенне-зімні час.

У ліпені прыйшлі датацыйныя сродкі. Папраўдзе, як і прагназавалася, іх аб’ём стаў значна меньшым. РВК апынуўся ў складанай сітуацыі: цягам бліжэйшых 2-3 месяцаў трэба павялічыць збіраемасць грашовых адзінак з тэрыторыі раёна без спадзеваў на дапамогу згары.

**Пухавіцкі раён — адзіны ў вобласці дзе і медустановы і установы адукацыі не аплацілі пастаўку прадуктаў для харчавання дзяцей і хворых у траўні-чэрвені 2009 г.**

Вынікам такіх роздумаў стала рашэнне Пухавіцкага РВК за № 1246 “Аб мерах па рэалізацы рашэння Пухавіцкага Савета дэпутатаў “Пра раённы бюджэт на 2009 год”.

### Галоўнае — распадзел адказнасці

Сыходзячы з логікі эканамічнай палітыкі Беларусі цагам апошніх двух год у галіне лібералізацыі эканомікі, ад рашэння РВК можна было чакаць нейкіх мер па спрыянню развіццю прадпрымальніцтва, мер па падтрымцы вырабнікоў. Аднак у чыноўнікаў выканкаму логіка свая. Яе можна сфармуляваць трыма словамі: Кантраляваць, Ізьяць, Пакараць. Слова “зрабіць” у пераліку няма.

Што ж прапануецца канкрэтна? Рэальныя меры пачынаюцца з чацьвертага раздзела дакуманта. Раздзел 4 прысвечаны працы з сельскімі і пасялковымі саветамі і выканкамамі. І тут раённае ноў-хаў. Пункт 4.2: Вырашана “прыпыняць альбо змяншаць у 2009 годзе перадачу сродкаў з раённага бюджэта бюджэтам сельскіх і пасялковых саветаў у разе парушэння /імі/ устаноўленага рашэннем райвыканкаму парадку залічэння падаткаў, збораў і іншых абавязковых плацяжоў, іных паступленняў у раённы бюджэт”.

У наступным пункце яшчэ цікавей: вырашана пагашаць запазычынасці саветаў і выканкамаў ніжэйшага ўзроўню за кошт прызначаных для іх бюджэтам сродкаў. Сярод абгрунтаванняў, па якіх можа быць прыменена дадзеная норма прысутнічае “у выпадку невыканання імі рашэнняў райвыканкаму альбо распараджэнняў старшыні райвыканкаму”. Допіс пра старшыню РВК адзін з самых цікавых у дакуманце.

А у разе, калі на месцах будзе “-” у бюджэце РВК з радасцю прадаставіць “бюджэтны крэдыт” (пункт 4.4).

Калі падсумаваць, то праца з саветамі і выканкамамі ніжэйшых узроўняў будуецца па наступным прынцыпе: Мы вам кажам што рабіць і гэта мае быць выканана любой цаной. Іначай не дадзім грошай. А калі не будзе хапаць на заробкі — возьмеце ў нас крэдыт пад “адэкватны” працэнт. Словы пра вывучэнне сітуацыі на месцы ці распрацоўку эканамічных захадаў па стымуляванню збіраемасці падаткаў у раздзеле адсутнічаюць.

Дарэчы, аналагічная сіутацыя і з арганізацыямі, якія рэалізуюць свае праграмы за кошт бюджэта альбо прыцягваюць бюджэтныя крэдыты ці крэдыты пад гарантыі бюджэта.

Але, самым цікавым уяўляецца пункт 7.3 дакуманта. Яго варта працытаваць без скарачэнняў. “Прыняць меры па безумоўнаму забеспячэнню усімі бюджэтнымі арганізацыямі паступленняў даходаў ад пазабюджэтнай дзейнасці з ростам, параўнаўча з 2008 годам па адукацыі — не меней 12%, культуры — 15%, ахове здароў’я — 14%, фізічнай культуры — 25%, сацыяльнай абароне — 3%, сельскай гаспадарцы —10%. Давесці адпаведныя заданні да кожнай бюджэтнай арганізацыі і ўсталяваць кантроль за іх выкананнем”.

Такім чынам, прапануецца каб медыкі замест лячэння, настаўнікі замест навучання, сацпрацаўнікі замест дапамогі абяздоленым займаліся заробкай грошай. А нам з вамі варта чакаць цэннікаў за такія экзатычныя паслугі як, напрыклад, карыстанне прыбіральняй у паліклініцы ці нечым падобным. Прынамсі, пачатак навучальнага года ў школах пройдзе пад знакам “збора грошай з бацькоў”. Але, да жалю, значная частка сабраных сродкаў пойдзе не на патрэбы школ а на падтрымку раённых чыноўнікаў. Дарэчы, указаныя ў дадзеным пункце % — адзіныя канкрэтныя лічбы на ўвесь дакумант.

Намёкам на лічбы таксама можна лічыць пункт 8.9 які гучыць так “правесці інвентарызацыю расходнай часткі раённага бюджэта і прыняць меры па скарачэнню бюджэтаў дзеля забеспячэння іх сбалансаванасці”. У перакладзе на звычайную мову — бюджэт будуць рэзаць. А гэта азначае новыя сюрпрызы як для “бюджэтнікаў” так і для звычайных жыхароў ужо бліжэйшым часам.



Хаванне галавы ў пясок, як паказывае досвед жыцця страўсаў, з’яўляецца хутчэй спосабам самазаспакаення чым вырашэння праблемы.

# Уцяпляемся

## Жыхары Свіслачы прымусілі працаваць КУП "Жылкампаслугі-Свіслач"



Працаўнікі КУП "Жылкампаслугі-Свіслач" выконваюць работы, якія яшчэ год таму называлі "абсалютна непрымальным, незаконным і псуючым выгляд будынкаў"

© Свіслацкі веснік

Наша газета пісала тое, што жыхары дамоў №№ за кошт узгодненай пазіцыі і прынцыповасці вымусілі ў лютым прыехаць у пасёлак намесніка старшыні райвыканкаму спадара Іосіфа Кучко. А праз месяц дамагліся і абследавання дамоў цеплавізарам.

Вынік несуцяшальны па ўсіх даследаваных кватэрах. Папраўдзе нават у акце абследавання не абйшлося без сюрпрызаў: ў дакуманце фігуруюць не больш за траціну ад агульнай колькасці даследаваных прыборам кватэр.

Група грамадзянаў, якая была ініцыятарам "змагання за цяпло" бліжэйшым часам запатрабуе ў экспертнай арганізацыі іх копію акта. І ў разе, калі і там няма поўнага спісу — настойліва папрасіць тлумачэнняў і складання новага дакумента.

А тым часам, КУП "Жылкампаслугі Свіслач" абвесціла новы від паслугі. У разе калі жыхар за свае грошы набывае пліты для ўцяплення, камунальшчыкі гатовыя іх змантаваць бясплатна. У гэтай сітуацыі паказальны той факт, што яшчэ 2 гады таму кіраўніцтва прадпрыемства называла такі варыянт "частковага уцяплення" абсалютна непрымальным, незаконным і псуючым выгляд будынкаў.

Логіку камунальшчыкаў зразумець можна. Жыхарам, чые кватэры фігуруюць у акце даследвання КУП "Жылкампаслугі Свіслач" АБАВЯЗНА за свае сродкі ўцяпліць сцены. Людзі з гэтых халодных кватэр праз суд могуць яшчэ і спагнаць досыць вялікія сумы за неякаснае аказанне паслуг па тэхабслугоўванню дома. Таму для ЖКХ цыццёва важна скараціць колькасць такіх "праблемных кватэр". І калі некаторыя гатовыя патраціцца на матарыялы, то для КУП "Жылкампаслугі Свіслач", натуральна, больш выгодна прафінансаваць толькі мантаж, чым поўны аб'ём работ + суму, прайграную ў судах.

Аднак, той факт, што жыхары вымусілі КУП "Жылкампаслугі Свіслач" задумацца пра якасць аказваемых работ і, няхай пад пагрозай судоў, пачаць рэальна забяспечваць тэхабслугоўванне жылога фонда, ужо радуе. i

# Завод жыве

## ЗГВ спадзяецца спакойна "пераджыць крызіс". Падставы для аптымізма ёсць

Паводле справаздачы кіраўніцтва Завода Горнага Воска, рэканструцкыя прадпрыемства блізкая да завяршэння. Агульны аб'ём прыцягнутых інвестыцый мае перавысіць 41,172 мільядра рублёў.

Завяршэнне работ дазволіць ЗГВ выйсці на выпуск штогод 18 тысяч тон тэхнічных парафінаў з нафтавага гачу навапалацкага "Нафтана". Адначасова ААТ ЗГВ мае сваю долю і ў пабудаванай у Свіслачы Першай Мэблевай фабрыцы.

Такім чынам, пасля завяршэння абодвух праектаў, капіталізацыя ААТ "ЗГВ" мае павялічыцца ўдвая. Праграмы развіцця прадпрыемства былі высока ацэнены дзяржаўным эканамічным саветам як адпаведныя патрабаванням працаёмкіх, высокатэхналагічных вытворчасцяў. Усе гэтыя факты даюць падставы для аптымізма як кіраўніцтву так і працаўнікам Завода Горнага Воска. i



Любіш праўду?
Прагнеш справядлівасці?
Маеш што сказаць іншым?
НАМ ПА ДАРОЗЕ
Чытай, пішы, працуй з намі. Твае лісты чакаем на:
sviesnik@gmail.com
МЫ НЕ ПЛАЦІМ ГРОШЫ — МЫ ДАЕМ СЛОВА!

# У эканоміцы стане вальней

### Урад Беларусі працягне курс на лібералізацыю эканомікі

Як паведаміў дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Аляксандр Ліхачэўскі, рыхтуецца чарговы указ, які мае на мэту спрасціць умовы вядзення гаспадарчай дзейнасці. Праект указа зацвярджае закрыты пералік ліцэнзуемых відаў дзейнасці і складальнікаў работ і паслуг. Цяпер у Беларусі ліцэнзуюцца 53 віды дзейнасці. Агульная колькасць выдадзеных ліцэнзій складае 218 тысяч. З іх юрасобам выдадзены 72 тысячы, ІП — 144 тысячы, грамадзянам — 1,7 тысячы.

"Калі прэзідэнтам будзе падтрыманы праект указа, то мы мяркуем, што гэта дазволіць скараціць агульную колькасць ліцэнзуемых відаў дзейнасці на 8—9 і больш чым на 50 — колькасць складальнікаў работ і паслуг", — сказаў прадстаўнік Мінэканомікі.

Праект указа, паводле яго слоў, таксама пераглядае розныя арганізацыйныя моманты. У прыватнасці, прадугледжана скарачэнне тэрмінаў ажыццяўлення працэдур ліцэнзавання ў сферы аховы здароўя, транспарту, знешняга гандлю, турыстычных паслуг, будаўніцтва.

"У мэтах удасканалення працэдур, звязаных з праектаваннем, будаўніцтвам і ўводам у эксплуатацыю аб`ектаў, вызначаны парадак правядзення праектных работ па наступным этапе пры адначасовым будаўніцтве аб`ектаў", — адзначыў Ліхачэўскі.

Таксама спрошчаны парадак правядзення аўкцыёнаў і конкурсаў, распараджэння дзяржмаёмасцю. Акрамя таго, прадугледжана вызваленне ад падаткаабкладання сум, што ў рублёвым падліку павінна пакінуць у суб`ектаў гаспадарання прыкладна 2 трлн. беларускіх рублёў.

> Прапануецца скараціць колькасць ліцэнзаваных відаў дзейнасці, спрасціць правядзенне аўкцыёнаў і конкурсаў

Прадстаўнік Мінэканомікі таксама нагадаў аб падрыхтоўцы адмены ліцэнзавання рознічнага гандлю і грамадскага харчавання, за выключэннем гандлю падакцызнымі таварамі — алкаголем і тытунём.

Паводле яго слоў, з 1 студзеня 2012 года плануецца адмяніць і ліцэнзаванне перапрацоўкі рыбы і морапрадуктаў. Адпаведнае рашэнне было прынятае на нядаўняй нарадзе ў прэм`ер-міністра.

"Пасля адмены ліцэнзавання перапрацоўка рыбы і морапрадуктаў будуць рэгулявацца тэхнічнымі нарматыўнымі актамі, як гэта робіцца ў Расіі" — зазначыў Ліхачэўскі..

**БЕЛАПАН**

# Прыватызацыя — гэта сур’ёзна

### МВФ прымусіў урад стварыць структуру, адказную за прыватызацыю.



Дзяржкаммаёмасці Беларусі на прапанову місіі Міжнароднага валютнага фонду, ўнёс ва ўрад прапанову па стварэнні нацыянальнага прыватызацыйнага агенцтва.

Паводле ацэнкі МВФ, для аператыўнага ўплыву на гэтыя працэсы неабходна стварыць нацыянальнае агенцтва па прыватызацыі, якое павінна мець паўнамоцтвы па распараджэнні маёмасцю. Агенцтва павінна мець магчымасць прыцягваць кансультантаў замежных кампаній, падтрымліваць сувязі з вядомымі сусветнымі фірмамі для правядзення ацэнкі маёмасці прадпрыемстваў.

"Але, каб у корані зрушыць гэта прынцыповае пытанне і вырашыць яго станоўча, неабходна надаць новай структуры ўсе паўнамоцтвы па распараджэнні дзяржмаёмасцю. На сённяшні дзень у Беларусі дзейнічае норма, па якой на адчужэнне хаця б адной акцыі інвестару або іншай юрыдычнай асобе неабходна рашэнне кіраўніка дзяржавы. Таму пакуль разглядаецца пытанне, як будзе прынята рашэнне па перадачы паўнамоцтваў аб распараджэнні дзяржмаёмасцю", - расказаў намеснік дырэктара Фонду дзяржаўнай маёмасці Дзяржкаммаёмасці Беларусі Пётр Лук’янаў.

# Канкардат з Ватыканам

### Стасункі Мінска і Святога Пасаду нарэшце атрымаюць вызначанасць.

Афіцыйны Мінск падрыхтаваў праект пагаднення паміж беларускім урадам і Святым пасадам (Канкардат). Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску ўпаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Беларусі Леанід Гуляка.

У звязку з гэтым плануецца візіт у Мінск дзяржаўнага сакратара Ватыкана кардынала Тарчызыё Бэртонэ, дата якога пакуль невядомая.

**Наша Ніва**

# Мастар-клас ад NATO

Без гучных палітычных заяў Міністэрства абароны мацуе супрацоўніцтва з краінамі NATO



Інструктары NATO вучаць нашых вайскоўцаў на базе беларускіх цэнтраў і маюць намер запрашаць іх на стажыроўкі ў свае краіны

Цягам ліпеня ў СМІ з’явіліся адразу два паведемленні, якія яшчэ год таму адносіліся да катэгорыі “не для друку”. На пачатку месяца Міністэрства Абароны паведаміла пра працу інструктараў Бундэсвэра ў 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгадзе Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання. Паводле афіцыйнай інфармацыі асноўная мэта візіту ў Беларусь інструктараў мабільнай вучэбнай групы Цэнтра Бундэсвера палягала ў падрыхтоўцы міратворчых падраздзяленняў ААН. Аднак у тым жа прэс-рэлізе было ўказана, што візіт нямецкіх вайскоўцаў праходзіў ў рамках праграмы НАТА “Партнёрства дзеля міру”.

Арганізаваныя немцамі заняткі падзяляліся на практычную і тэарэтычную часткі.

У ходзе практычных заняткаў беларускія вайскоўцы вывучылі досьвед бундэсвера па выкананню абавязкаў у складзе “замежных кантынгентаў”, патрулявання і суправаджэння грузаў на “нелаяльнай тэрыторыі” і іншыя патынні.

Тэарэтычная частка палягала ў абмене досьведам у пытаннях уплыву рэлігійных, культурных і этнічных асаблівасцей на выкананне задач у розных краінах.

Амаль у гэты ж час пасол Францыі ў Беларусі Мірэй Мюсо на прэс-канферэнцыі ў Мінску заявіла пра зацікаўленасць ў **далейшым развіцці** (выдзелена рэакцыяй СВ) вайсковых кантактаў памім Францыяй і Беларуссю. Яна падкрэсліла, што ў дзвюх краін “ужо склаліся некаторыя адносіны” ў гэтай галіне.

> Францыя плануе арганізоўваць стажыроўкі для ваеннаслужачых і памежнікаў

“У нас няма ніякага намеру іх перапыняць, а наадварот, мы хацелі б, каб яны развіваліся.

Паводле яе слоў, Францыя плануе арганізоўваць стажыроўкі для ваеннаслужачых і памежнікаў. “На жаль, у нас няма магчымасці развіваць ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва так, як мы хацелі б. Размова ідзе пра адсутнасць паўнавартаснага фінансавання гэтых праграм, таму што Францыю таксама закрануў сусветны фінансавы крызіс”, — зазначыла Мюсо.

Дыпламат падкрэсліла, што ў пасольства Францыі наладжаны добрыя кантакты з Міністэрствам абароны Беларусі ў сферы культурна-гістарычнага супрацоўніцтва. У прыватнасці, у Мінабароны створана група, якая дапамагае ў пошуку і перапахаванні астанкаў салдат арміі Напалеона на тэрыторыі Беларусі.

# Ёсць мяжа

Беларусь і Літва парафіравалі мяжу

Рэспубліка Беларусь і Літоўская Рэспубліка парафіравалі дамову аб рэжыме дзяржаўнай мяжы. Дамову падпісалі старшыня Дзяржаўнага памежнага камітэта Беларусі Ігар Рачкоўскі, і намеснк дырэктара дэпартамента ўсходняга суседства МЗС Літоўскай Рэспублікі Зянонас Куметайтыс.

Прэм’ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, каментуючы вынікі падпісання, адзначыў, што ў бліжэйшы час на ўзроўні ўрадаў будзе прынята рашэнне па спрошчанаму перамяшчэнню грамадзян у 50-кіламетровай зоне па абодва бакі ад беларуска-літоўскай мяжы. “Гэта дасць магчымасць 600-700 тыс. чалавек перамяшчацца па спрошчанай сістэме з мэтай развіцця сваяцкіх, добрасуседскіх і бізнесадносін”, - дадаў ён.

*БелТА*

**Парафіраванне —** папярэдняе падпісанне дагавора (або яго асобных артыкулаў) ініцыяламі ўпаўнаважаных.

# Грошы небагатым

Аляксандр Лукашэнка 6 ліпеня падпісаў Указ № 371 “Аб ільготным спажывецкім крэдытаванні”

Права на атрыманне льготных спажывецкіх крэдытаў будуць мець грамадзяне, у якіх сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям’і, падлічаны за тры месяцы, якія папярэднічалі месяцу заключэння крэдытнага дагавора, не перавышае трохразовага сярэднямесячнага сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям’і з чатырох чалавек (цяпер — 1130,8 тыс. рублёў).

Функцыі па выдачы такіх крэдытаў ускладваюцца на ААТ “Ашчадны банк”, “Беларусбанк”, “Белаграпрамбанк”, “Белінвестбанк”, і “Белпрамбудбанк”. Крэдыты будуць выдавацца ў беларускіх рублях тэрмінам да трох гадоў з выплатай 10% гадавых за карыстанне імі.

Дзяржава за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту возьме на сябе нагрузку ў выглядзе кампенсацыі страт банкаў ад выдачы льготных крэдытаў.

Як адзначае прэс-служба, “прыняцце ўказа дазволіць аказаць дадатковую дзяржаўную падтрымку малазабяспечаным слаям насельніцтва, што з’яўляецца яшчэ адным рэальным дзеяннем, накіраваным на ўмацаванне сацыяльнай абароненасці жыхароў нашай краіны”.



# У суд як дадому

Арганізацыі Пухавіцкага раёна усё часцей становяцца фігурантамі спраў у гаспадарчым судзе

Інтэрнэт-рэсурс "Свіслач: рэгіянальны партал" праводзіць маніторынг судовых цяжбаў з удзелам суб'ектаў гаспадарання раёна у гаспадарчым судзе Мінскай вобласці. На сайце быў апублікаваны аналіз рагляду спраў за чэрвень-ліпень 2009 г. Нягледзячы на тое, што лета — сезон найменьшай дзелавой актыўнасці, сумарны аб'ём іскаў, якія разглядаліся ў судзе і тычыліся Пухавіцкага раёна склаў 775 099 312 беларускіх рублёў + 421,6 еўра.

Чэрвень абыйшоўся амаль без "судовага дабівання" Пухавіцкай картоннай фабрыкі (іск на 1,5 мільёна можна не лічыць), якая раней прайграла працэсаў на суму, параўнаўчую з паўгадавым абаротам прадпрыемства. Сярод даўжнікоў зьявіўся новы лідар — Пухавіцкае раённае таварыства спажывецкай кааперацыі (РАЙПО). За перыяд з 10 чэрвеня па 9 ліпеня з гэтай арганізацыі ў судовым парадку спрабавалі спагнаць 35 726 тысяч рублёў даўгоў. Крэдыторы — прадпрыемствы, якія пастаўлялі сваю прадукцыю на рэалізацыю у сістэму спажыўкаперацыі. Дарэчы, факт неразлікаў за рэалізаваную прадукцыю ўжо прыцягваў увагу кіраўніцтва галіны. Але раённы райспажыўсаюз абраў цікавую тактыку "дрэйфа": калі прадпрыемства адмаўляецца адгружаць прадукцыю у звязку з неаплатай папярэдніх паставак, пухавіцкае РАЙПО... шукае новых пастаўшчыкоў. Тут дарэчнымі выглядаюць словы прывітання старшыні аблвыканкаму Леаніда Крупца да працаўнікоў спажыўкаперацыі ў звязку з іх прафесійным святам (пачатак ліпеня): "Благодаря высокому профессионализму и преданности делу работники потребкооперации наращивают объёмы торгового оборота.... оказывают поддержку товропроизводителям".

На другім пачэсным месцы даўжнікоў знаходзіцца ТАА "Будаўнічыя металаканструкцыі". Прадпрыемства запазычала пастаўшчыкам больш за 27 мільёнаў рублёў. І гэта ў час дэклараванага росту будаўнічага рынку краіны.

Не нашмат адстаюць сельгасвырабнікі Пухавіччыны. У іх праз суд спрабавалі вернуць 16 мільёнаў рублей і 400 еўра. Сярод неплацельшчыкаў СПК "Сітнікі", СПК "ШАЦК", КСУП "Чырвонагвардзейскі", СПК "Зазерка" а таксама СПК з сімвалічнай назвай "Іскра Надзеі". Агульная сума запазычанасці, якую спрабавалі спагнаць праз суд з суб'ектаў гаспадарання раёну складае 125 873 362 рублі + 421,6 еўра.

**Нам таксама вінны.**

Сума іскаў прадпрыемстваў раёну па спагнанню грошай са сваіх даўжнікоў уражвае яшчэ больш. Арганізацыі раёна падалі іскі на 649 225 950 рублёў. Аднак, такі аб'ём забяспечаны збольшага двумя юоыдычнымі асобамі, якія з-за непляцяжоў ужо пачалі адчуваць сур'ёзныя праблемы. Гэта Пухавіцкі камбінат хлебапрадуктаў (608 956 558 рублёў аплаты за пастаўленую прадукцыю) і Эксперыментальная база "Свіслач" (36 346 967 беларускіх рублёў). Аб'ём неплацяжоў, параўнаўча з траўнем вырас болей чым на 10 мільёнаў рублёў. Пры гэтым праблемы Свіслачы месяц ад месяца пааглыбляюцца — усё большая частка партнэраў не спяшаецца плаціць па рахунках.



Такім чынам, за месяц найменьшай дзелавой актыўнасці (параўнаўча з іншымі перыёдамі года) аб'ём неплацяжоў якія разглядаліся судом склаў больш за 775 мільёнаў рублёў. А калі лічыць, што ад кожнага рубля плацяжу дзяржава ў той ці іншай форме атрымлівае да 35 капеек падаткаў (менавіта такая ў Беларусі сярэдняя падатковая нагрузка), то атрымліваецца што за месяц бюджэт Пухавіцкага раёна і бюджэты вышэйшых узроўняў недаатрымалі прынамсі 270 мільёнаў рублёў падаткаў.

Але гэтая сума — вяршыня айсбергу. Гаспадарчы суд прымае справы на разгляд пры пратэрмінаванасці 3 і больш месяцаў. У дататак, большасць прадпрыемстваў падае іск як крайні сродак уздзеяння. Кіраўнікі лічаць за разумнае даць пэўны час даўжнікам. Таму агульная сума неплацяжоў за гэты перыяд паводле самых сціплых падлікаў прынамсі ў 2,5-3 разы большая. І гэта адлюстраванне вынікаў гаспадарання "канца зімы", Што будзе рабіцца ў судзе бліжэй да кастрычніка — цяжка сабе ўявіць.

Але нават гэтая сума, з улікам змяншэння датацый ужо вельмі адчувальная для раённай эканомікі.

**Іскавыя прэтэнзіі да суб'ектаў гаспадарання раёна за прамежак часу з 10.06 па 9.07.2009г.**

| ДАЎЖНІК: | Сумарны памер іскаў |
|---|---|
| ТАА "Будаўнічыя металаканструкцыі" | 27 248 968 |
| Пухавіцкае раённае спажывецкае таварыства (РАЙПО) | 35 726 404 |
| ПГВУП "ІНФОКАР-ПЛЮС" | 10 594 715 |
| УП "Жылцепласэрвіс" | 7 682 267 |
| Іншыя суб'екты гаспадарання | 35 618 754 |
| Сельгас вырабнікі раёна | 16 684 521 + € 421,6 |
| РАЗАМ ПА РАЁНУ | 125 873 362 |

# Медыцына

## Пухавіцкі раён — лідар па колькасці вакантных пасадаў лекараў сярод раёнаў Мінскай вобласці

Паводле Міністэрства аховы здароў'я Беларусі, узровень забяспечанасці медычным персаналам Мінскай вобласці самы горшы ў краіне. На 10 000 чалавек прыходзіцца толькі 36 лекараў, што на 26% меней за сярэднебеларускі ўзровень. Да прыкладу, у Гродзенскай вобласці гэты паказчык складе 52. Аднак і ў гэтым "сумным лідарстве" ёсць свае героі. Найгоршая сітуацыя па колькасці медперсаналу ў Пухавіцкім раёне.

Сайт Пухавіцкага РВК ганарліва паведамляе, што паводле штатнага раскладу ў раёне існуе 198,5 "урачэбных" пасадаў. З гэтай колькасці занята 165. Але 45 чалавек – у дэкрэтным адпачынку. Такім чынам рэальна працуюць толькі 120 дактароў. Што складае толькі 60,4% ад патрэбы.

Існуюць пытанні і да кваліфікацыі "служкаў Гіпакрата". Паводле таго самага сайта РВК, катэгорыю атэстацыі маюць 58 чалавек ці 35% ад колькасці намінальна занятых (у т.л. і тых хто ў дэкрэтным адпачынку). Альбо толькі 29,2% ад агульнай колькасці лекарскіх пасадаў у раёне. Пры гэтым вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю мае толькі 1 лекар, што у статыстычным выражэнні складае 0,6% ад колькасці намінальна занятых. Першую катэгорыю маюць 35 чалавек ці 21%, другую – 22 асобы (13%). Варта зазначыць, што другая катэгорыя даецца пасля першых курсаў падвышэння кваліфікацыі (праз 3-5 год працы) і іспыт на яе досыць "нескладаны". Таму той факт, што 65% дактароў не маюць ніякай атэстацыйнай кваліфікацыі выклікае пэўныя апасенні што да якасці прапанаванага імі лячэння.



**Праблемы адавоч:** У 2007 годзе дэпутаты пассавета "з боем" патрабавалі сродкі на рамонт харчаблоку ў Свіслацкай бальніцы: вада з працякаючага даху залівала нават электрашчыток. Дах адрамантавалі, а лекары мелі "сур'ёзную размову" за тое, што дазволілі зрабіць здымкі праблемных месцаў бальніцы.

© svislac.belarda.org

Такі стан медыцыны ўжо перарастаў быць сакрэтам раённых уладаў. Пра праблемы Пухавіцкай медыцыны пісала і рэспубліканская прэса. У якасці асноўных прычын падобнай сітуацыі можна назваць наступныя:

1. Надзвычай малы узровень аплаты працы.
2. Незадавальняючыя сацыяльныя ўмовы працы (адсутнасць жытла, кепскае фінансаванне саміх мед установаў і г.д.)
3. Блізкасць сталіцы, дзе прапануюцца значна лепшыя ўмовы і у разы вышэйшы заробак.

Сыходзячы з меркаванняў здаровага сэнсу, кіраўнікі раёна мелі бы неяк планаваць шляхі вырашэння праблемы. А гэта патрабуе сродкаў. Аднак, замест гэтага медпрацаўнікам прапануецца... эканоміць і выконваць сацыяльныя стандарты ў галіне медабслугоўвання без дадатковага фінансавання. Вынікам стае тое, што Цэнтральная раёння бальніца не ў стане заплаціць нават за харчаванне сваіх пацыёнтаў.

Можа тады сродкі пайшлі на іншыя, больш актуальныя патрэбы? Свіслацкі пассавет з ініцыятывы дэпутатаў Шычко і Харламавай яшчэ ў 2007 годзе прыняў рашэнне пра "замацаванне" месцаў у інтэрнатах за медустановамі ў разліку на магчымасць запрашэння медперсанала. Пры гэтым, таго часу дадзеная рашэнне Свіслацкіх дэпутатаў выклікала "абурэнне" у раёне. Выканкам не лічыў дадзенае пытанне актуальным. Часткова на тэрыторыі пассавета праблема вырашылася і за кошт здачы ў эксплуатацыю Дружненскай паліклінікі, дзе, нагадаем у адным крыле абсталяваныя ўмовы для пражывання медпрацаўнікоў.

Сёлета Пухавіцкаму райвыканкаму выдзелілі сродкі на якія быў закладзены 60 кватэрны дом для медыкаў у Мар'інай Горцы. Аднак, гэта не здымае праблему пражывання маладых спецыялістаў. Яны па-ранейшаму усімі праўдамі і няпраўдамі інмкуцца пазбегнуць размеркавання ў Пухавіцкі раён альбо, калі такое не атрымалася, як раней з'ехаць адсюль.

> Узровень аплаты медперсанала ў прапанаваных РТМА вакансіях у **3 разы ніжэй** за адпаведны паказчык па Беларусі.

З гэтага году за кошт абласнога бюджэта ў медычных ВНУ Беларусі створана 104 месца. Студэнты-медыкі будуць навучацца ў Беларускім дзяржаўным медуніверсітэце, Гродзенскім, Віцесбкім і гомельскім медычных універсітэтах. Праз 5-6 год яны абавязаны вернуцца на працу ў вобласць.

Падчас кампаніі размеркавання найбольшая колькасць маладых спецыялістаў была накіравана ў Мінскую вобласць. Аднак, з 317 размеркаваных на Міншчыну выпускнікоў амаль усе выказалі нежаданне працаваць у нашым раёне.

У такіх умовах Мінскі аблвыканкам настойліва параіў Пухавіцкаму РВК заключаць адмысловыя дамовы са студэнтамі-платнікамі медычных

# без медыкаў

навучальных устаноў. Паводле такой дамовы, раённыя ўлады будуць сплачваць кошт навучання. За гэта малады чалавек вымушаны будзе адпрацаваць у Пухавіцкім раёне па 2 гады за кожны аплочаны год навучання. Такім чынам, максімальная колькасць “адпрацоўкі” можа скласці 12 год (улічваючы шасцігадовае навучанне па некаторых спецыяльнасцях таго ж МДМУ).

Схема, па шчырасці, вельмі нагадвае тую, якая была скарыстана ў 14-16 стагоддзях у працэсе запрыгоньвання сялан. Таго часу феадал таксама дапамагаў селяніну грашыма ў абмен на абавязак “адпрацаваць”.

Умовы дванаццацігадовага прыгону, мусіць, не ўразілі студэнтаў: за чатыры месяцы актыўнай агітацыі райвыканкам угаварыў аж цэлага аднаго чалавека. Менавіта такую лічбу дае “Народная газета” ад 23.07.2009.

Каб зразумець прычыну уцёкаў медыкаў з раёна, можна таксама звярнуцца ў аддзел занятасці насельніцтва. На сёння Раённае тэрытарыяльнае медычнае аб’яднанне падала інфармацыю пра 20 адкрытых вакансій (з іх 17 – медперсанал). Узровень аплаты працы шакуе: сярэдняя прапанаваная стаўка складе 272 тысячы рублёў. Калі дадзеную суму параўнаць з сярэднім заробкам медработнікаў у краіне становіцца страшна. Паводле дадзеных Дзяржкамстата Беларусі, сярэдняя налічаная заработная плата ў галіне аховы здароў’я за чэрвень склала 824 731 рублі. У вакансіях пухавіцкага РТМА гэты паказчык у 3 разы ніжэйшы. А па чатырох вакансіях узровень зарплаты НІЖЭЙ за афіцыйны бюджэт пражытковага мінімума ў Беларусі (з 1.082009 года - 249 тыс. 410 рублёў).

Даруйце, але пасля такога становіцца зразумела, чаму медыкі “бягуць” з раёна і чаму выпускнікі-медыкі ўсімі праўдамі і няпраўдамі стараюцца абмінуць Пухавіцкую зямлю. Прыехаць працаваць, напрыклад, у Друженскую бальніцу на стаўку ў 285 тысяч рублёў да не маючы ў дадатак жытла можа пагадзіцца альбо вялікай душы чалавек, альбо той, каму самому патрэбна тэрміновая дапамога псіхіятара. Іншы варыянт – працаваць і актыўнейшым чынам “браць падзяку” ад пацыентаў. Але гэта ужо арыткул крымінальнага кодэкса. **i**



| Колькасць лекараў на 10 тыс. насельніцтва | |
|---|---|
| г. Мінск (без арганізацый абл. падпарадкавання) | 76,8 |
| Брэсцкая | 40,0 |
| Віцебская | 46,5 |
| Гомельская | 40,3 |
| Гродзенская | 52,2 |
| Мінская (з улікам арганізацый абласнога падпарадкавання ў г. Мінску) | 36,0 |
| ПУХАВІЦКІ РАЁН (фактычна працуе, без уліку д.а.) | 16,78 |
| Магілёўская | 39,0 |
| Рэспубліка Беларусь (сярэдні паказчык) | 48,5 |

Сітуацыя ў раённай медыцыне не дае ўпэўненасці ў магчымасці атрымаць своечасовую медычную дапамогу ад кваліфікаванага лекара.

**Вакансіі Пухавіцкага РТМА станам на 04.08.2009 г.**

| Вакансія (у дужках пазначана месца працы) | Патрэбная адукацыя | Сталая/ часовая праца | Прапанаваны заробак |
|---|---|---|---|
| **Медычная сястра (Рудзенская бальніца)** | **сярэдне-спецыяльная** | **Сталая праца** | **226** |
| Электрагазазваршчык | ПРАФЕСІЙНА -ТЭХНІЧНАЯ | Сталая праца | 226 |
| **Медычная сястра (Свіслацкая бальніца)** | **сярэдне-спецыяльная** | **Сталая праца** | **243** |
| Медычная сястра | сярэдне-спецыяльная | Сталая праца | 252 |
| Фельдшар (Шацкая і Талькаўская участковыя бальніцы) | сярэдне-спецыяльная | Сталая праца | 252 |
| Фельдшар | сярэдне-спецыяльная | Сталая праца | 252 |
| Малодшая медсястра па догляду за хворымі | БЕЗ АДУКАЦЫІ | Сталая праца | 200 |
| **Лекар-спецыяліст (Праўдзінская бальніца)** | **ВЫШЭЙШАЯ** | **Сталая праца** | **285** |
| **Лекар-спецыяліст ( Дружненская бальніца - 2 чал., Пухавіцкая амбулаторыя - 2 чал.)** | **ВЫШЭЙШАЯ** | **Сталая праца** | **285** |
| Лекар-спецыяліст | ВЫШЭЙШАЯ | Сталая праца | 285 |
| **Лекар-спецыяліст (Рудзенская бальніца)** | **ВЫШЭЙШАЯ** | **Сталая праца** | **285** |
| Фельдшар-лабарант | сярэдне-спецыяльная | Сталая праца | 252 |
| **Фельдшар-лабарант (Рудзенская бальніца)** | **сярэдне-спецыяльная** | **Сталая праца** | **252** |
| Загадчык аддзелам | ВЫШЭЙШАЯ | Сталая праца | 351 |
| Загадчык аддзелам | ВЫШЭЙШАЯ | Сталая праца | 479 |
| Акушэрка | сярэдне-спецыяльная | Сталая праца | 252 |
| **Акушэрка (Свіслацкая бальніца)** | **сярэдне-спецыяльная** | **Сталая праца** | **252** |
| Інжынер па тэхнічнай эксплуатацыі цеплатэхнічнага абсталявання | ВЫШЭЙШАЯ | Сталая праца | 268 |

# Единожды соврамши

**ЗАТ “Август-Бел” не спяшаецца выконваць агучаныя кіраўніцтвам абяцанкі. Нават у пытаннях заробкаў для сваіх працаўнікоў.**

Закрытае акцыянернае таварыства “Август-Бел” рыхтуецца да пуска свайго прадпрыемства. У ліпені “Август” фактычна скончыў фармаванне свайго штата. Прынамсі, апошнія вакансіі, якія былі размешчаны ў цэнры занятасці датуюцца менавіта 07.2009 года.

У звязку з інфармацыяй, якую раней распаўсюджвала кіраўніцтва прадпрыемства, не можа не выклікаць здзіўлення памер заяўленай заработнай платы. Нагадаем, што ў красавіку 2008 у інтэрвью агенцтву БелТА кіраўнік “Август-Бел” спадар Рыжкоў заявіў: “- На предприятии будет создано до 300 рабочих мест в 2009 году со средней зарплатой не менее $500. Мы обязательно будем строить жилье для своих работников. В традициях компании “Август” также поддержка спорта, образования, детских домов и интернатов. Эти традиции найдут свое воплощение и в Беларуси.” Пазней, падчас сустрэчаў з грамадскасцю, кіраўніцтвам “Августа” называлася іншая, значна большая лічба – эквівалент 750 амерыканскіх даляраў.

Выкананне гэтага абяцання ілюструе табліца апошніх вакансій ЗАТ “Август-Бел”. У пераліку дадзеных працоўных месцаў памер аплаты працы вагаецца ад 750 тысяч беларускіх рублёў да 1 млн. 400 тысяч. А сярэдні памер прапанаваных заробкаў складае крыху больш чым 891 тысяча рублёў. Даруйце, але нават без уліку падзення курса беларускага рубля ў адносінах да амерыканскай валюты, гэта толькі блізу 425 даляраў. Па актуальным курсе сума наагул смешная – каля 300 даляраў. Пры гэтым, у 2008 годзе “Август” пазіцыянаваў сабе як прадпрыемства з узроўнем заробку “вышэй за сярэдні па краіне”. А сёння, паводле нацыянальнага статыстычнага камітэта, сярэдні заробак у Беларусі склаў 1 014 762 рублі ці на 120 тысяч болей за указаны “Августам”. А калі паглядзець у галіне Хімічнай вытворчасці дзе сярэдні узровень аплаты працы на 07.2009 склаў 1 425 789 рублі – розніца становіцца яшчэ больш адчувальнай. “Багаты інвестар” прапануе заробкі на 47,6% меньшыя за сярэднія па галіне. Ці пойдзе добры хімік на працу дзе ўзровень заробку усяго толькі 62,4% ад СЯРЭДНЯГА па галіне, мяркую, рытарычнае пытанне.



...будет создано до 300 рабочих мест в 2009 году со средней зарплатой не менее $500. Мы обязательно будем строить жилье для своих работников.

**Віктар Рыжкоў**
Дырэктар ЗАТ "Август-Бел", БЕЛТА, 03.04.2008

| Вакансія | сталая/часовая праца | заробак тыс. р. |
|---|---|---|
| Бугалтар (стаж ад 5 год) | сталая | 1400 |
| Кіроўца аўтамабіля | сталая | 950 |
| Грузчык | сталая | 800 |
| Майстар змены (досьвед працы) | сталая | 900 |
| Машыніст кампрэсарных установак (д. п.) | сталая | 750 |
| Падсобны працаўнік | сталая | 690 |
| Транспартавальнік | сталая | 800 |
| Укладчык-пакавальнік | сталая | 800 |
| Электраманцёр па рамонту і абслугоўванню электраабсталявання (досьвед працы) | сталая | 930 |
| **Сярэдні заробак** | | **891,11** |

Такім чынам атрымліваецца, што альбо дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва сказала няпраўду, альбо “маніпулявалі лічбамі” прадстаўнікі “Август-бел”. Агенцтву БелТА у нас пакуль не давяраць прычын няма. А вось што да “Августа”, то невыкананне абяцанняў па заробках стала фактычна апошнім у ліку з невыкананых абяцанняў. Нагадаем, што ў розныя часы з вуснаў розных прадстаўнікоў ЗАТ “Август-бел” гучалі наступныя абяцанні:

- ***Узел грамадскасці ў маніторынгу экалагічнай сітуацыі на і вакол завода*** *(В. Рыжкоў, сустрэча ў ліпені 2007 года.)*
- ***Забяспечыць адкрытасць усёй дакуменатцыі па будаўніцтву і экалагічнай бяспецы*** *(Нам. дырэктара ЗАТ “Август-Бел”. С. Багданаў. Інтэрвью ТУТ.бай, 24.04.2009 г.)*
- ***Пабудова жытла працаўнікам прадпрыемства ў пасёлку Дружны ці пасёлку Свіслач*** *(В. Рыжкоў, дырэктар ЗАТ “Август-Бел”. Інтэрвью БелТА. 03.04.2008, ён жа, сустрэчы з жыхарамі Свіслачы і Дружнаша ў 2007-2008 гг.)*

**Працаўнікі “Августа” будуць атрымліваць у сярэднім на 47,6% меней за сваіх калег на іншых прадпрыемствах хіміі й нафтахіміі.**

- ***ЗАТ “Август-Бел” не будзе транспартаваць ніякія свае грузы праз тэрыторыі пасёлкаў Свіслач ці Дружны*** *(В. Рыжкоў, сустрэча з грамадскасцю на ЦЭЦ-5, красавік 2008 г.)*

Папраўдзе, да гонару “Август-Бел”, у адным яны, прынамсі часткова, пастараліся датрымацца слова. Задэклараваныя вялікія інвестыцыі ў сацыяльную сферу вылліліся падарункамі дзецям са школы інтэрната. Не будзем спрачацца што да аб’ёма “падаруначнага фонду” а проста скажам шчыры дзякуй за дапамогу дзецям.— адзінае дзе “Август” паспрабаваў датрымацца дадзенага слова. Для падцверждання дадзенай думкі прыводзім табліцу абяцанняў кіраўніцтва ЗАТ “Август-Бел” і выканання гэтых абяцанняў.

# Асноўныя абяцанні ЗАТ "Август-Бел", якія агучваліся кіраўніцтвам прадпрыемства ў прэсе альбо на сустрэчах з жыхарамі

***(сабраны толькі тыя, якія дакументальна падцверджаны артыкауламі у СМІ, сценаграмамі альбо аўдыёзапісамі)***

| Абяцанне ЗАТ "Август-Бел" | Калі, кім і я ўкой форме выказана | Інфармацыя пра выкананне (ці абвяржэнне) |
|---|---|---|
| "Август-Бел" ажыццяўляе будаўніцтва адпаведна жаданню жыхароў і паводле вынікаў грамадскіх слуханняў | Праектная дакументацыя | Грамадскіх слуханняў належным чынам не правадзілася.<br>Пад грамадскімі слуханнямі кіраўніцтва Фірмы разумее сустрэчы з дэпутатамі пассавета і некаторымі прадстаўнікамі грамадскасці напрыканцы ліпеня 2007 г. Аднак на той сустрэчы галасаванне НЕ ПРАВОДЗІЛАСЯ. Пасля абдыліся 6(!!!) сходаў жыхароў на якіх людзі прагаласавалі СУПРАЦЬ будаўніцтва. |
| Дакументацыя ЗАТ "Август-Бел" заўсёды адкрыта для жадаючых. Закрытая толькі рэцэптура | Віктар Рыжкоў, дырэктар ЗАТ "Август-Бел", сустрэча з грамадскасцю ліпень 2007, пас. Свіслач<br>Намеснік дырэктара ЗАТ "Август-Бел". С. Багданаў. Інтэрвью парталу ТУТ.бай ад 24.04.2009 г. | Пухавіцкі Райвыканкам аднес дакуменатцыю ЗАТ "Август-бел" да дакуменатцыі для службовага карыстання і не даў доступ да яе прадстаўнікам грамадскасці. Суд Пухавіцкага раёна прызнаў правату райвыканкама падчас разгляду іска Анастасіі Рысявец у гэтым пытанні (канец 2008 г.) |
| Грамадскасць будзе мецъ доступ да кантроля экалагічнай сітуацыі на і вакол прадпрыемтсва. Август згодзен стварыць адмысловую экалагічную групу з ліку мясцовых жыхароў | Віктар Рыжкоў, дырэктар ЗАТ "Август-Бел", сустрэча з грамадскасцю ліпень 2007, пас. Свіслач | "Паводле беларускага заканадаўства грамадзяне НЕ БУДУЦЬ мець паўнамоцтваў ажыццяўляць экалагічны маніторынг на і вакол завода ЗАТ "Август Бел"."<br>Галоўны санітарны урач Беларусі, сустрэча з грамадскасцю на ЦЭЦ-5, красавік 2008 г. |
| Август-Бел не будзе транспартаваць ніякай прадукцыі праз населеныя пункты Свіслач і Дружны | Віктар Рыжкоў, дырэктар ЗАТ "Август-Бел", сустрэча з грамадскасцю на ЦЭЦ-5, красавік 2008 г. | Ліпень 2009 года. Машыны ЗАТ "Август-Бел" курсуюць праз прыватны сектар (катэджную забудову) пас. Свіслач і па дарозе ў зоне адпачынку ля воз. Мацярынскае |
| ЗАТ "Август-Бел" не будзе захоўваць і транспартаваць свае адыходы нават па тэрыторыі завода. Усё будзе абясшкоджвацца на месцы. | *"- ...Как таковой, цех очистных сооружений проектом не предусматривается. Для завода такого профиля это устаревшее решение. Чтобы не транспортировать отходы по всей территории предприятия, на каждой из шести запланированных технологических линий будет построен экологический блок. Он включает в себя фильтры белорусского производства для очистки воздуха, российское оборудование для его мокрой очистки и плазменный дожигатель запахов "Ятаган""*<br>Віктар Рыжкоў, дырэктар ЗАТ "Август-Бел". Інтэрвью БелТА. 03.04.2008 | Очистные сооружения заложены в проект.<br>... Отходы, которые будут возникать в технологическом процессе (тара из-под сырья, вода и ветошь после мытья производства), никуда не вывозятся. Твердые отходы будут складироваться в контейнеры, жидкости — в бочки, и раз в несколько месяцев утилизироваться.<br>Намеснік дырэктара ЗАТ "Август-Бел". С. Багданаў. Інтэрвью парталу ТУТ.бай ад 24.04.2009 г. |
| ЗАТ "Август-Бел" — вялікая колькасць працоўных месцаў з вялікай заработнай платай | *сярэні заробак на заводзе складзе не меней за 750 даляраў ЗША*<br>Віктар Рыжкоў, дырэктар ЗАТ "Август-Бел", сустрэча з грамадскасцю ліпень 2007, пас. Свіслач<br>*"На предприятии будет создано до 300 рабочих мест в 2009 году со средней зарплатой не менее $500"*<br>Віктар Рыжкоў, дырэктар ЗАТ "Август-Бел". Інтэрвью БелТА. 03.04.2008 | Узровень заробкаў гл. вышэй. |
| ЗАТ "Август-Бел" будзе будаваць жытло для сваіх работнікаў | *"Мы обязательно будем строить жилье для своих работников."*<br>Віктар Рыжкоў, дырэктар ЗАТ "Август-Бел". Інтэрвью БелТА. 03.04.2008 | Штат набраны на 80% жытла нікому пры наборы на працу не абяцалі. Август НЕ звяртаўся нават пад папярэдні выбар пляцоўкі для жылога дома. Працоўнікі інтэрнатам НЕ забяспечваюцца |
| ЗАТ "Август-Бел" будзе ажыццяўляць інвестыцыі ў сацыяльную сферу | *В традициях компании "Август" также поддержка спорта, образования, детских домов и интернатов. Эти традиции найдут свое воплощение и в Беларуси.*<br>Віктар Рыжкоў, дырэктар ЗАТ "Август-Бел". Інтэрвью БелТА. 03.04.2008 | ЗАТ "Август-Бел" некалькі разоў перадаваў падарункі дзіцячым інтэрнатам. І гэта ўсё. |

# Кожнаму па дозе



"Непрыкметны парашок" на фальзе — адзін з самых небяспечных сінтэтычных наркотыкаў.

## Пухавіцкі райсуд асудзіў наркадылера, які вез у раён рэкордную партыю наркотыка

У студзені 2009 года упраўленнем КДБ па Мінску і Мінскай вобласці на дарозе Мінск-Гомель быў затрыманы 32 гадовы жыхар Мінска Дзедзейка ў якога пры даглядзе машыны было знойдзена каля 1 кілаграма парашкаабразнага рэчыва. Пазнейшая экспертыза ўстанавіла што знойдзены парашок з'яўляецца метамфетамінам – адным з наймацнейшых сінтэтычных наркотыкаў. Паводле супрацоўнікаў КДБ, Дзедзейка меў за мэту продаж партыі на тэрыторыі Пухавіцкага раёна. Дзеля гэтага і ехаў у Мар'іну Горку.

Кілаграм сінтэтычнага наркотыка – гэта своеасаблівы рэкод для Пухавіцкага раёна. Паводле ацэнак супрацоўнікаў КДБ, мінімальны кошт такой партыі складе блізу 25 тысяч даляраў. А ў разе расфасоўкі на "дозы" – блізу 0,1 мільёна. А калі ўлічыць, што 1 доза метамфетаміну складае ад 0,08 да 0,2 г. залежна ад "якасці тавара", то наркадылер вёз найменей 5 тысяч доз. Што складае 1 дозу на кожных 15 жыхароў раёна ўключна са старыкамі і немаўлятамі. Рэалізоўваць наркотыкі планавалася на дыскатэках і моладзевых "тусоўках" раёна.

Наркадылеры – не чыноўнікі і ім не патрэбныя "справаздачы пра выкананне запланаваных паказчыкаў". Яны таксама не схільны ствараць складскіх запасаў – занадта небяспечна. Адпаведна на рэалізацыю вязуць роўна тую колькасьць наркотыка, якая будзе раскуплена цягам бліжэйшага часу. І завоз на тэрыторыю раёна нават 5 тысяч доз "моладзевага наркотыка" (пры колькасці моладзі векам ад 10 да 25 каля18 тысяч чалавек) кажа пра сур'ёзнасць праблемы наркаманіі у раёне. Ускосна гэты факт падцвярджаецца і нядаўней гісторыяй пасёлка Дружны. Нагадаем, што ў прамежку з 2003 па 2004 гг. Сінтэтычныя наркотыкі можна было купіць... на прыступках Дружненскай СШ. Звароты бацькоў у міліцыю, на жаль, не давалі належнага выніку. У рэшце рэшт група Дружненскіх мужчын "па бацькоўску" пагаварылі з прадаўцамі зелля. Пасля непрацяглага лекавання наркадылеры вырашылі пераключыцца на больш бяспечныя для іх здароў'я ўчасткі продажу. У тым ліку і ў райцэнтры. Магчыма да іх і ехаў затрыманы кур'ер.

> Колькасці доз, якую вёз кур'ер хапіла бы кожнаму 15 жыхару раёна уключна са старыкамі і немаўлятамі

А тым часам, Суд Пухавіцкага раёна прызнаў грамадзяніна Дзедзейка вінаватым і прысудзіў пакаранне ў выглядзе 10 год пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Паколькі прыгавор не быў абскарджаны, ён уступіў у законную сілу. i

**Даведка:**

**Метамфетамин** (на сленге: мет, meth, лёд, кристалл, тина, заводка, Винт, первый) — производное амфетамина, белое кристаллическое вещество. C10H15N, использующееся в форме гидрохлорида, как наркотик, ещё более стимулирующий, чем амфетамин. Вводится, как правило, внутривенно, перорально (через рот), ингаляционно.

**При** длительном употреблении вызывает непреодолимую психическую зависимость, особенно в случае внутривенного введения кустарно приготовленным из эфедрина препаратом. Синдром отмены выражен слабо. Рецидивы употребления частые. 90 % применяющих его наркоманов приобретают стойкие психические расстройства (слабоумие,параноидальные проявления, двигательные расстройства и др.).

Свіслач: РЭГІЯНАЛЬНЫ ПАРТАЛ

НАШ партал

Аператыўна, праўдзіва, трапна. Тое, што цікава для Свіслачы й Дружнага

Пішам пра тое, што баяцца казаць іншыя

Мы адкрыты для усіх меркаванняў.

Раздзелы партала:
- Навіны Свіслачы і Дружнага
- Навіны Беларусі і Свету
- Даведкавая інфармацыя пра рэгіён:
  - Гісторыя
  - Турызм і адпачынак
  - Спорт
  - Эканоміка
  - Развіццё
  - Улада
- Расклад транспарту ва ўсіх накірунках
- Інфарамцыя па будоўлі завода ЗАТ "Август-Бел" (у тым ліку копіі дакумантаў, аналітыка).
- Бесплатныя прыватныя абвесткі
- Блогі

пра НАШЫ пасёлкі

svislac.belarda.org

# Гіне рыба

## У рацэ Свіслач чарговы мор рыбы. Дзяржаўныя органы альбо маўчаць альбо кажуць пра "прыродныя прычыны"


© brik.org

У пачатку ліпеня берагі Свіслачы на некаторых месцах былі ўсеяны мёртвай рыбай.

У рацэ Свіслач у ліпені назіраўся чарговы мор рыбы. Ягоныя масштабы значна перавысілі тыя, пра якія пісалася ў мінулым нумары СВ.

Першымі трывогу забілі рыбакі. Пачынаючы з першых чыслаў ліпеня, яны паведамлялі пра мор рыбы ня толькі ў Свіслачы але і ў іншых вадаёмах Стоўбцаўскага, Дзяржынскага і Копыльскага раёнаў. Пасля сыходу паводак, які быў выкліканы надзвычай моцнымі дажджамі, вада ў рэках і азёрах набыла незвычайны выгляд, агідны пах гніення. Паводле сведкаў, у найгоршых участках да вады папросту цяжка падыйсці – смурод як ад "жыжы" на фермах. Па вадзе йдуць рознакаляровыя разводы.

На шчасце, найбольшага масштабу ліха набрала ніжэй па цячэнню за Свіслач і Дукору. Пачынаючы ад ракі Цітаўка і да Асіповіцкага водасховішча рака стала "мёртвай". Яшчэ 6-10 ліпеня па паверхні плавала напаўжывая альбо ўжо мёртвая рыба. Амаль месяц рака Свіслач была проста вадой без аніякага жыцця. А ўсё дно малых рэк было літаральна ўсцелена мёртвай рыбай.

У якасці прычын высоўваліся некалькі версій – ад скідвання ядахімікатаў у рэкі да прарыву ачыстных збудаванняў. Аднак, супрацоўнікі дзярджінспекцыі схіляюцца да іншай думкі: у выніку надзвычай моцных дажджоў падняўшаяся вада заліла лугі. На фоне спякотнай тэмпературы пачалося гніенне травы. І з вяртаннем "гнілой вады" у рэкі рэзка ўпала утрыманне кісларода (на некаторых вадаёмах у 10 і болей разоў). У выніку – мор рыбы. У той жа час самі эколагі сцвярджаюць, што такой складанай сітуацыі яны не памятаюць прынамсі 15-20 год. У падцверджанне свайго заключэння ўказваюць на тое, што паблема прысутна на вялікай колькасці вадаёмаў адразу ў некалькіх раёнах. І заўважаюць, што на поўнае аднаўленне экасістэмы месцамі можа спатрэбіцца ад двух да трох год.

Паводле іншага меркавання, без удзелу чалавека тут не абыйшлося. Вада разілвалася і раней. На найбольш пацярпелай рацэ, Нёмане, разлівы нагул адбываюцца па некалькі разоў на год. І увесь гэты час мора рыбы не было. Таму, магчыма, прычына палягае ў выкарыстанні на палях нейкага новага віда ядахімікатаў і патрапленне гэтага рэчыва ў рэкі. Падцверджаннем такой думкі ёсць іншы факт – мор рыбы назіраўся ў сельскагаспадарчых раёнах, дзе былі затоплены культывуемыя палі. А там дзе затаплівала звычайныя лугі – мора няма. (Вярхоў'і Свіслачы, Нёмана, шэраг азёраў Дзяржынскага раёна). Хаця, па ідэі, трава мусіць гніць аднолькава што на калгасным полі што на пойменам лузе. На карысць гэтай думкі таксама указвае і практычна поўнае маўчанне СМІ пра праблему. Ў нас зазвычай афіцыйная журналістыка маўчыць толькі ў тым выпадку, калі трэба пачакаць "афіцыйнай версіі здарэння".

У любым разе, паводле водгукаў рыбакоў, Свіслач "ажыла" бліжэй да 25 ліпеня. Чаго не скажаш, напрыклад, наконт верхоў'яў Нёмана.

# Часныковая злачыннасць



## У часе крызіса набывае адмысловыя рысы і злачыннасць.

Лозунг 30-х гадоў "сеў за мех бульбы" ізноў становіцца актуальным. На фоне падзення ўзроўню жыцця насельніцтва, злодзеі радыя любой здабычы. Ліпень у нашай міліцыі прайшоў пад дэвізам "шукаем скрадзены часнык".

У ноч на 9 ліпеня ў вёсцы Седча невядомыя паўтарылі "подзвіг свіслацкіх падпальшчыкаў" - гарэў "Фіат" аднаго з мясоцвых жыхароў. Заведзена крымінальная справа. Матарыяльная шкода вымяраецца аб'ёмам каля 18 млн. рублёў.

Той жа ночы двое жыхароў раёна паспрабавалі зарабіць на апахмелку — разбілі шкло ў дачным масіве блізу Голацку і спрабавалі залезці ў будынак. На лецішчы начавала гаспадыня — 57 гадовая мінчанка. Гарарабаўнікі запатрабавалі грошы, альбо, прынамсі, паўлітра. Жанчына не толькі выклікала міліцыю, але і арганізавала абарону свайго будынка да прыезда патрульнай машыны.

10 ліпеня, міліцыя шукала... цяля, якое было скрадзена напярэдадні з поля блізу вёскі Ўзляны. Як высветлілася, цяла вырашыў дагадоўваць вайсковы пенсіянер Д., які пражывае непадалёк (у в. Грэбень). Жывёла вернута гаспадару.

15 ліпеня малады жыхар Дружнага вымушаны быў вяртацца дадому ў плаўках пасля заплыву ў Мацярынскім возеры. У часе "водных працэдур" невядомыя скралі ягоную вопратку. Маці хлопца заявіла ў міліцыю.

У ноч на 18 чэрвеня з агарода 65 гадовай жыхаркі Сяр-

геевіч сабралі ўраждай часныку. Як высветлілася, скарыстацца вітамінамі меў намер 24 гадовы мясцовы жыхар. Сума нанесенай шкоды пенсіянерцы ацэнена ў 79 тысяч рублёў. Часнык вернуты гаспадыні.

29 ліпеня ў вёсцы Пухавічы невядомы падцвердзіў фразу "кролікі ето не толькі ценный мех но ісчо..." - з падворку мясцовага жыхара былі скрадзены 10 кралей. Міліцыя вядзе расследванне.

# Гульні дарослых



**Музейны комплекс “Дудуткі” распачаў традыцыю святкавання найбольш вядомай старонкі айчынай гісторыі — Грунвальдзкай бітвы. Першае мерапрыемства задало досыць высокую планку якасці што да ўзроўня правядзення.**

Тыя з жыхароў Свіслачы і Дружнага, якія не пашкадавалі часу і правялі 18 і 19 чэрвеня ў Дудутках, былі ўзнагароджаны адразу некалькімі знакавымі падзеямі, якія арганізатары здолелі змяціць у двухдзённай праграме фэсту.

Першай стала выстава найвядомейшых фомастакоў краіны пад назвай “Недетскіе ігры”. Працы, натуральна, былі прысвечаны рэканструкцыі рыцарства і сярэдневечнай культуры ў нашай краіне. Дарэчы, для экспазіцыі быў абраны досыць незвычайны фармат. Фотаздымкі былі аддрукаваны на вялікіх палотнах і развешаны ўздоўж галоўнай алеі комплекса.

Другім складнікам падзеі ў Дудутках стаў менавіта рыцарскі турнір. У музейны комплекс з’ехаліся блізу 150 рыцараў у поўным узбраенні.

І яны мелі што паказаць гледачам. Гэта і двубоі рыцараў і бугурты (масавыя рыцарскія бойкі) і, натуральна рэканструкцыя фрагментаў Грунвальдзкай бітвы. Але разынкай фэсту сталі рыцарскі турнір на конях, які праводзіўся у поўнай адпаведнасці правілам 13 стагоддзя з бойкамі адзін-на-адзін. Папулярнымі былі і эфектныя відовішчы ад мінскага экстрым-тэатру Berserk. Такога спалучэння ў межах аднаго рыцарскага фэсту ў Беларусі яшчэ не было.

Для тых, каго прываблівалі больш “спакойныя аспекты” сярэдневечнай культуры сапраўдным адкрыццём стаў конкурс жаночага адзення 13-16 стагоддзяў. Традыцыйна разбіты блізу месца правядзення двубояў рыцарскі лагер таксама не пакінуў нікога абыякавым. Асабліва дзяцей. Дзе яшчэ можна жыўцом пабачыць як жылі рыцары ў паходах, альбо паглядзець ( і нават прымераць на сабе) элементы даспехаў.

> У Дудуткі з’ехаліся каля 300 рэканструктараў. З іх блізу 150 рыцараў у поўным узбраенні

Разам з рыцарскім фэстам адбываўся музычны. Дудуткі прымалі ўжо добра вядомыя ва Ўсходняй Еўропе гурты гурты “Стары Ольса”, “Пераплут”, “Яварына”, “Кейлі Кёл” ды іншыя. Кампанію “рэканструктарам сярэдневечнай музыкі” складалі рок-гурты, натхнёныя сярэднявечнай эстэтыкай: Allion, Seven Seals, Rosalia...

У агуле, дзякуючы блізу тром сотням “рэканструктараў сярэдневечча”, кожны глядач на два дні акунаўся ў атмасферу ВКЛ часоў Вітаўта Вялікага. i



© БЕЛАПАН



© budzma.org

# Паехалі



© tourdebelarus.by

**У Беларусі стартавала першая нацыянальная велагонка. Два з шасці этапаў праводзяцца на нашай тэрыторыі.**

Сёлета ў Беларусі адбыўся старт першага ў гісторыі веласіпеднага “Tour de Belarus”, які, па аналогіі з аналагічнымі мерапрыемствамі Еўропы (тур дэ Франс, джыра д’Італія) ёсць адкрытым спаборніцтвам куды могуць заявіцца як мясцовыя спарцмены так і атлеты з іншых краін. Паводле афіцыйнага сайта спаборніцтваў «Tour de Belarus™»/«Тур Беларусі™», - традыцыйнае адкрытае міжнароднае спартовае мерапрыемства, якое праводзіцца ў фармаце веласіпеднага прабега па тэрыторыі Беларусі.

> «Tour de Belarus™» будзе фінішаваць у Дружным

Першы тур Беларусі праходзіць у 6 этапашў. Сёлета 5 з іх праводзяцца як велапрабегі і толькі апошні будзе паўнацэннай гонкай.

Першы этап стартаваў 31 траўня і прайшоў па Лагойшчыне. Па яго выніках лідарам стаў мінчанін Аляксандар Яцко. Другі і трэці этапы стартавалі у чэрвені і пачатку ліпеня адпаведна і прайшлі па Мінскім Стоўбцаўскім раёнах. У гэтых гонках жоўтую майку лідара апранаў Арцём Карыцька.

20 ліпеня падзея, якая з’яўляецца знакавай для усіх спартсменаў-веласіпедыстаў Беларусі завітала ў Мар’іну Горку. Чацьверты этап, які стартаваў у Сталіцы і фінішаваў у райцэнтры прывёў акрамя іншага, да змены лідара. У складаных умовах надвор’я, калі тэмпература даходзіла да +35 перамогу вырваў майстар спорта па веласіпедным спорце Аляксей Камароў.

Варта зазначыць, што суседнія краіны так і не здолелі паагарнізаваць уласныя спаборніцтвы такога класу. У Расіі гэта немагчыма з прычыны адсутнасці вялікіх працягласцяў дарог з пакрыццём адпаведнай якасці. Украіна - нават не спрабавала праводзіць падобныя масштабныя мерапрыемствы. Таксама няма нацыянальных гонак у Польшчы і краінах Балтыі. Таму, пры наяўнасці добрай арганізацыі, Тур Беларусі мае шансы стаць уплывовым рэгіянальным спаборніцтвам.

І тым больш прыемна, што ён праходзіць і на нашай тэрыторыі. І, дарэчы, фініш апошняга, шостага этапа, паводле арганізатараў, плануецца ў Дружным.

# Пажар і спорт

**Пажарная дружына ЦЭЦ-5 — лепшая ў раёне**

У пачатку ліпеня адбыліся спаборніцтвы дабраахвотных пажарных дружын раёна. На мерапрыемства з’ехаліся “грамадскія пажарнікі” з прадпрыемстваў, якія ў разе пажару могуць уяўляць небяспеку для навакольных населеных пунктаў. Гэта лясгас, льнозавод, доследна-эксперыментальнага завод, газанапаўняльная станцыя (цэх прыроднай і звадженай газы), торфапрадпрыемства “Сяргеевіцкае”, КУП “Жылкампаслугі Свіслач,” Камбінат хлебапрадуктаў і, натуральна, энэргетыкі з ЦЭЦ. Каманда ЦЭЦ-5 чарговы раз і стала лепшай.

Спаборніцтвы адбываліся як у выглядзе камадных заданняў, так і ў асабістым заліку. Асноўнай часткай было пераадоленне 100 метровай “паласы пажарных перашкод”. Адзіны хто на паласе здолеў стварыць больш-меньш сур’езную канкурэнцыю ЦЭЦаўцам быў падстаўнік камбіната хлебапрадуктаў Г. Аўчарэнка, які ў асабістым заліку паказаў 2-е месца з адрывам ад лідара, апаратчыка ЦЭЦ-5 А. Пікуліка, меньшым за 2 секунды.

Нечаканай адметнасцю спаборніцтваў стала адсутнасць “новага канкурэнта”. Гаворка ідзе пра прадпрыемства 1-га класу небяспекі - завод ЗАТ “Август-Бел”. На такіх вытворчасцях дружыны маюць быць у абавязковым парадку. Аднак, нягледзячы на тое, што фірма ўжо збіраецца распачынаць выпуск прадукцыі, пажарная дружына там... не створана. І, падобна, ЦЭЦаўскім дабраахвотным пажарнікам ў разе назвычайнага здарэння прыйдзецца “выручаць” хімікаў.

> Пажарная дружына ЦЭЦ-5 — найлепшая ў раёне. А пажарнай дружыны ЗАТ “Август-Бел” не існуе, нягледзячы на клас несяспекі завода.

# Расце змена

**Моладзевая зборная “пажарнікаў” — трэцяя ў вобласці**

18-20 ліпеня на беразе Плешчаніцкага водасховішча адбыўся VI абласны палявы лагер “Юны ратаўнік” і Злёт Міснкага абласнога аддзялення БМГА “ратаўнікоў-пажарных”.

Цягам чатырох дзён на прыродзе акрамя адпачынку абдыліся тэматычныя спаборніцтвы.

Па выніках усіх конкусраў трэцімі, з невялікім адставаннем ад лідараў, сталі удзельнікі зборнай пухавіцкага раёна з красамоўнай каманднай назвай “Без праблем!”

# Надзеі і расчараванні

**У ліпені ФК "Рудзенск" паспяхова завяршыў першы круг чэмпіяната, правёў міжнародны матч і прайграў гульню 1/16 кубка.**

22 ліпеня з ініцыятывы трэнера МТЗ-РІПО Юрыя Пунтуса "Рудзенск" правёў таварыскі матч з фарм-клубам каманды з Катара "Аль Сайлійа" (نادي السيلية الرياضي). "Аль Сайлійа" мінулага году дабіўся права выступаць ў першым дывізіёне нацыянальнага першынства. Па выніках мінулага сезону займала 9 месца ў розыгрышы (з 10 удзельнікаў). Адпаведна, яе фарм-клуб па сілах супаставімы з Беларускімі камандамі 1-2й лігаў.

Мэта сустрэчы чыталася адразу: Юры Пунтус на фоне не лепшага выступу ягонай каманды і браку грошай у спонсараў прыглядаў "недарагіх" і здольных навічкоў. Адпаведна мэтам будавалася і гульня. Трэнер "Рудзенска" Іван Барташэвіч дазволіў сабе "пагуляць" заменамі і апрабаваць практычна кожнага футбаліста. "Рудзенск" распачаў матч з традыцыйнага штурму брамы суперніка. Аднак у сярэдзіне 1-га тайма катарцы выраўнялі гульню. Апошнія хвіліны першай паловы былі ізноў за "Рудзенскам". Лік длюстроўвае ход гульні: 2-1 насля 1 тайма.



На жаль, зварот да нябёсаў не прынес перамогі "Рудзенску" у супрацьстаянні з "Мінскам"

© svislac.belarda.org

У перапынку абодва трэнеры замянілі ці не ўвесь склад. На поле выйшлі гульцы, якія досыць рэдка патраплялі ў аснову. Моладзь шмат атакавала але бракавала даскладнасці ў ударах. Толькі на 90-й хвіліне гульні Сяргей Міскіў паставіў завяршальную кропку. 3-1 на карысць "Рудзенска".

26 ліпеня "Рудзенск" правёдзіў выездны матч (перанесеную гульню 1-га круга) супраць віцебскага "Мясакамбіната". З прычыны фінансавых праблем, нашага суперніка, які паводле папярэдніх адзнак меў быць у лідарах лігі, ліхарадзіць ужо 4-ы месяц. Ідзе гаворка нават пра зьняццё каманды са спаборніцтваў. Як і ў таварыскай гульні, на поле "Рудзенск" выпусціў шмат моладзі. А на трыбунах ізноў прадстаўнікі МТЗ-РІПО. "Рудзенск" досыць упэўнена кантраляваў ход гульні, але бракавала дакладнасці ў завяршэнні атак. Калі лічыць, 100% моманты, то ўжо па выніках першага тайма лік мусіў быць 4-0. Усё, на што быў здатны "Мясакамбінат" - гэта па адной адносна вострай атацы ў кожным з таймаў. Выніковы лік гульні заканамерны — 3-0 на карысць "Рудзенска".

Пасля першага круга першынства "Рудзенск" замацаваўся на першым радку турнірнай табліцы з адрывам ад бліжэйшага суперніка ў 3 заліковыя пункты.

У першым туры 2-га круга "Рудзенск" удзелу не браў. Супернік ("Мясакамбінат") папрасіў перанесці матч. Такім чынам да кубкавай сустрэчы 8 жніўня наша каманда падыйшла у неблагім стане.

Супернік у кубку дастаўся сур'ёзны — ФК "Мінск", які займае 8-мы радок турнірнай табліцы вышэйшай лігі. Дарэчы, "гаражане" маюць непасрэднае адношанне да суперніка 1/32 фінала: ФК "Мінск" быў сфармаваны ў выніку рэарганізацыі ФК "Тарпеда"

Ход кубкавай гульні, на жаль, расставіў ўсё на свае месцы. Першая палова сустрэчы прайшла не ў звычайных атаках "Рудзенска", а ў прэсінгу гасцей. Гаражане практычна цалкам перайгралі нашу лінію паўабароны і метадычна, ударамі з розных адлегласцей, пачалі "расстрэльваць" браму "Рудзенска". І ўжо на 14-й падключыўшыйся да атакі абаронца "Мінска" Павал Рыбак адкрывае лік: 0-1 на карысць гасцей.

Прапушчаны гол канчаткова расхістаў абарону нашай каманды. З'явілася шмат браку і тэхнічных памылак. Вынік не прымусіў сабе чакаць. На 20-й хвіліне прызначаецца пенальці у браму "Рудзенска". Яго рэалізуе 25-і гадовы нападнік "Мінска" Дзьмітры Асіпенка. А праз 5 хвілін той жа Асіпенка завяршыў голам чарговую вострую атаку гасцей: 0-3.

"Зрабіўшы гульню" мінскія гульцы дазволілі "Рудзенску" агрызнуцца двума вострымі атакамі напрыканцы першага тайма. Але брак тэхнічнай майстэрнасці даў пра сабе знаць: галоў не было і на перапынак каманды сыйшлі пры тых жа 0-3 на табло.

Другі тайм праходзіў у значна больш спакойнай абстаноўцы. Гульцы гасцей не нагняталі тэмп. А "Рудзенск" па-ранейшаму спрабаваў падступіцца да штрафной "Мінска". Адна з атак нашай каманды скончылася трапным ударам Аляксея Хадневіча на 61-й хвіліне. Лік стаў 1-3. "Рудзенск", адчуўшы магчымасць выратаваць гульню паспрабаваў усімі сіламі ісці наперад. Але, паўабарона і абарона "Мінска" спыняла большасць атак на падыходах да штрафной. А напрыканцы другога тайма стала бачна, што нашы футбалісты папросту стаміліся. Хуткасці ўпалі. І апошнія хвіліны каманды фактычна дагульвалі.

Такім чынам 1-3 і "Рудзенск" пазбавіў сабе магчымасці згуляць у 1/8 Кубка Беларусі. Гледзячы па узроўню каманд (Вышэйшыя ліга супраць другой) вынік прагназаваны. Але тым не меньш крыўды для фанаў "Рудзенска".

Свіслацкі Веснік

*Інфармацыйна-аналітычнае выданне пасёлкаў Дружны і Свіслач № 3(4), жнівень 2009 года.*
*Выходзіць не радзей 1 раз на месяц*
*Рэдактар: Канстанцін Фёдаравіч Мелевіч*
*e-mail рэдакцыі: sviesnik@gmail.com*
*Рэдакцыя можа не падзяляць пункт гледжання аўтараў артыкулаў і друкуе як матарыялы для дыскусіі. Адказнасць за дакладнасць выкладзеных у артыкулах фактаў нясуць аўтары.*
*Падпісана ў друк: 11.08.2009 г.*
*Аддрукавана на капіравальным апарацe рэдактара. Распаўсюджваецца бясплатна.*